# СТАНАЎЛЕННЕ ПАЧАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ Ў БССР У СЯРЭДЗІНЕ 20-х гадоў XX стагоддзя

*Забаўская І. І.*
*(Беларусь, Мінск)*

Пасля разгрому інтэрвентаў і завяршэння грамадзянскай вайны савецкая краіна прыступіла да мірнага гаспадарчага будаўніцтва. Асабліва пацярпела Беларусь, тэрыторыя якой на працягу шасці гадоў з'яўлялася арэнай ваенных дзеянняў. Многія гарады і вёскі былі разбураны ці спалены.

Першыя гады існавання савецкай школы былі прысвечаны перагляду зместу адукацыі. Перамены непасрэдным чынам адносіліся і да пачатковай адукацыі. Найбольш масавым звяном народнай школы ў рэспубліцы стаў першы канцэнтр сямігодкі (1–4 групы), які функцыянаваў самастойна. Адначасова з чатырохгадовай школай у вёсцы існавала і трохгадовая школа. У Гомельскай і Віцебскай губернях, якія да 1924 і 1926 гадоў уваходзілі ў склад РСФСР, захавалася дзевяцігадовая адзіная працоўная політэхнічная школа.

У праграмна-метадычных дакументах з 1921/22 гг. прадугледжвалася выхаванне асобы, зарыентаванай на працоўную дзейнасць на карысць краіны, акцэнтавалася ўвага на выхаванне дзяцей свядомымі і актыўнымі членамі грамадства. Пытанням выкарыстання грамадска-карыснай працы школьнікаў для выхавання ў іх грамадскай актыўнасці вялікую ўвагу надавалі тэарэтыкі савецкай педагогікі. Так, Н.К.Крупская вызначыла змест грамадска-карыснай працы, надавала ўвагу наладжванню сувязі паміж сельскімі і гарадскімі школамі, паміж школамі і прадпрыемствамі-шэфамі, пытанням прапаганды і агітацыі сярод насельніцтва, аказанню неабходнай дапамогі дзіцячым садам і пачатковай школе.

У Пастанове калегіі народнага камісарыята асветы ад 9–10 мая 1924 г. [1, с.78] было адзначана, што асноўнымі тыпамі вучэбных і культурна-асветніцкіх устаноў з'яўляюцца: а) дзіцячы сад; сямігадовая працоўная школа з нулявой групаю, якая ахоплівае дзяцей ва ўзросце 8–16 гадоў. Прычым, сямігадовая працоўная школа магла існаваць як поўная (0–7), і як асобны канцэнтр (0–3 і 4–7). У 1924/25 навучальным годзе колькасць вучняў пачатковай школы перавысіла даваенны ўзровень амаль на 3 %. Але шмат пачатковых школ былі аднакамплектнымі. Беднякі не мелі магчымасці стварыць неабходныя ўмовы для вучобы сваіх дзяцей. Не хапала адзення, абутку, школьных прылад.

Для падтрымкі вясковага настаўніцтва з мая 1924 г. наркамасветы і наркамзем прынялі інструкцыю аб адвядзенні зямлі пад агароды ўсім настаўнікам тых школ, якія знаходзіліся ў саўгасах. Акрамя таго, планавалася прыняць меры для таго, каб вучням школ, якія знаходзяцца ў саўгасах, была дадзена магчымасць "... наглядаць за работамі (пасеў, пасадка, уход за садам, агародам), дзе вучні пад кіраўніцтвам настаўніка або кіраўніка-агранома маглі б знаёміцца са спосабамі вядзення гаспадаркі. Адказнасць за стан пачатковых школ ускладва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лася і на кіраўніцтва саўгасаў" [2, с.76]. Адпаведна інстукцыі ад 25 чэрвеня 1924 г. школы і дзіцячыя ўстановы, якія знаходзіліся па-за гарадамі і пасяленнямі гарадскога тыпу, забяспечваліся зямельнымі ўчасткамі. Для пачатковай школы ён складаў 2–3 дзесяціны. За школамі і дзіцячымі дамамі замацоўваліся былыя маёнткі памешчыкаў разам з іншымі пабудовамі і садамі [3, с. 77]. На зямельныя органы ўскладаліся абавязкі дапамогі школам насеннем, інвентаром, неабходнымі спецыялістамі.

Вялікай праблемай для пачатковай школы была кваліфікацыя настаўнікаў. У 1927/28 навучальным годзе толькі 28 % з іх мелі педагагічную адукацыю, а многія закончылі толькі пяцігодку ці нават чатырохгодку.

У сярэдзіне 20-х гг. XX ст. педагагічных устаноў у БССР не хапала. Дзейнічалі 10 педагагічных тэхнікумаў: Мінскі Беларускі, Мінскі Польскі, Мінскі Яўрэйскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Магілёўскі, Віцебскі Яўрэйскі, Полацкі, Аршанскі, Мсціслаўскі [4, с. 79].

За параўнальна кароткі тэрмін органамі народнай адукацыі, грамадскасцю ва ўмовах разрухі была праведзена вялікая праца па пашырэнню школьнай сеткі, стварэнню ўмоў для ажыццяўлення ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання. У 1930 г. сацыяльны склад навучэнцаў пачатковых школ характарызаваўся наступнымі лічбамі: дзяцей сярэднякоў – 51,7 %, беднякоў – 25,6 %, батракоў – 1,1 %, калгаснікаў – 4,9 % [5, с. 139].

У 1934 г. выйшла Пастанова "Аб структуры пачатковай і сярэдняй школы ў СССР", якая вызначыла ўніфіцыраваную структуру школьнай адукацыі з пераемнасцю яе ступеняў. Былі ўстаноўлены наступныя тыпы школ:

– пачатковая школа;
– няпоўная сярэдняя школа;
– поўная сярэдняя школа.

Гэта структура з нязначнымі зменамі праіснавала да 1980 гг. і атрымала сусветнае прызнанне.

**Літаратура**


1. Аб сістэме народнай асветы // Асвета. – 1925. – № 1. – С. 78.
2. Павятовым аддзелам народнай асветы // Асвета. – 1925. – № 1. – С. 76.
3. Інстукцыя народнага камісарыята асветы і народнага камісарыята земляробства, ухваленая СНК БССР // Асвета. – 1925. – № 1. – С. 77.
4. Аб устанаўленні сеткі педагагічнае, індустрыяльна–эканамічнае, медычнае і мастацкае адукацыя ў БССР // Асвета. – 1925. – № 1. – С. 79.
5. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917 – 1945 гг.) / Г.Р.Сенькевіч, А.В.Трухан і інш. – Мінск : Народная асвета, 1993. – С. 139.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ